# *Педагогика,*
# *психология,*
# *методика*





*В.С. Болбас*

## АСВЕТНІЦКА-АТЭІСТЫЧНЫЯ ІДЭІ К.ЛЫШЧЫНСКАГА

Другая палова XVII ст. для Беларусі была тым перыядам, калі гісторыя нібы павярнулася назад. Эканамічны заняпад, разгул рэакцыі ў культурнай сферы характарызавалі тыя часы. Даследчыкі небеспадстаўна называюць гэты час цемрашальскім, змрочным у нашай гісторыі.

Пасля нездавальняючых вынікаў у барацьбе з рэфармацыйнымі плынямі ў Заходняй Еўропе каталіцкая царква актывізавала сваю дзейнасць на беларускіх землях, імкнулася такім чынам кампенсаваць панесеныя страты і палепшыць сваё становішча. Небывалага размаху дасягнула дзейнасць самых артадаксальных сіл каталіцкага духавенства. Папскія пасланнікі ўчынілі сапраўдны "крыжовы паход" на беларускія землі. У распаўсюджванні сваёй ідэалогіі імі выкарыстоўваліся ўсе магчымыя і немагчымыя метады і сродкі. Звычайнай з'явай сталі рэцыдывы ранняга сярэднявечча з іх ганеннем іншадумцаў, рэлігійным фанатызмам, кастрамі інквізіцыі, на якіх спальваліся кнігі і людзі.

Дзейсным правадніком ідэй контррэфармацыі выступаў ордэн езуітаў, які меў на Беларусі разгалінаваную сетку кляштараў і школ. Трэба адзначыць, што ў галіне асветы і выхавання езуіты дасягнулі значных поспехаў, бо мелі на той час добра прадуманую і адладжаную сістэму бясплатнай адукацыі. Развіццё езуіцкіх школ часта суправаджалася закрыццём праваслаўных. Акаталічванне адначасова з'яўлялася і апалячваннем насельніцтва. Традыцыйная для беларусаў талерантнасць была пахіснута дзяржаўнай палітыкай нецярпімасці да іншаверцаў і іншадумцаў. Беларусь, якая мела слаўныя традыцыі кнігадрукавання, адчувала востры кніжны голад.

Але ход гісторыі быў няўмольным. У нетрах феадалізму ўжо выспявалі парасткі новага ўкладу жыцця новай перадавой ідэалогіі і маралі, якія былі пасеяны Ф.Скарынай і яго паслядоўнікамі. Магутны ўплыў Адраджэння і Рэфармацыі поўнасцю знішчыць было немагчыма. Дэспатызм і неабгрунтаваная тыранія езуітаў выклікалі толькі адваротную рэакцыю. Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы, жыццё не спынялася і час ад часу заяўляла аб сабе даволі неардынарнымі праявамі. Менавіта да такіх можна аднесці жыццё і дзейнасць айчыннага педагога-атэіста Казіміра Лышчынскага.

Казімір Лышчынскі нарадзіўся 4 сакавіка 1634 г. у маёнтку Лышчыцы Брэсцкага павета. Небагатаму старадаўняму шляхецкаму роду Карчакаў-Лышчынскіх на той час належалі, акрамя, Лышчыцаў, двары Даброніж, Кустынь і Матыкалы і інш. Бацька будучага атэіста Еранім Казімір даў яму, самаму здольнаму з чатырох сыноў, добрую адукацыю. Паводле розных крыніц, юнак спачатку закончыў Брэсцкі ці Віленскі езуіцкі калегіум. У калегіумы прымалі дзяцей багатых радавітых шляхцічаў. Моўны курс калегіума налічваў 5 класаў, прычым пяты клас

прадугледжваў два гады навучання. I-III класы насілі назву граматыкі, IV-паэтыкі, V-рыторыкі. Адпаведна асноўнымі прадметамі былі лацінская і грэчаская мовы, паэтыка і рыторыка. Таксама ў калегіуме даваліся пачатковыя звесткі па матэматыцы, фізіцы, геаграфіі, гісторыі. Але ўсё навучанне і выхаванне было падпарадкавана галоўнай мэце – фарміраванню ў вучняў рэлігійнага фанатызму ці рабскай адданасці "Таварыству Ісуса" . Адным з галоўных пастулатаў выхаваўчай дактрыны заснавальніка езуіцкага ордэна генерала Лайолы было сцвярджэнне: "Каб ні ў чым не памыляцца, мы павінны вучыць, што тое, што мы бачым белым, есць чорнае, калі яго так называе святая царква".

Як сведчаць архіўныя крыніцы, пасля заканчэння калегіума К.Лышчынскі працягваў сваю далейшую адукацыю ў езуіцкіх навучальных установах Кракава і Каліша, якія рыхтавалі школьных настаўнікаў. У 24-х-гадовым узросце ўступіў у езуіцкі ордэн.

Як выхаванец і член ордэна, працаваў выкладчыкам у Львове, пазней-памочнікам рэктара Брэсцкага езуіцкага калегіума. Але ўласныя погляды маладога педагога прынцыпова адрозніваліся ад таго, што выкладалася ў школе. У 1666 г. ён выйшаў з ордэна з-за нязгоды з мэтамі і задачамі адукацыіі ў каталіцкіх навучальных установах, пасяліўся ў родным маёнтку, ажаніўся і заняўся актыўнай свецкай дзейнасцю.

Энергічны, эрудыраваны, здольны арганізатар, ён хутка заваяваў аўтарытэт тутэйшай шляхты, якая потым неаднаразова выбірала яго паслом ад Брэсцкага ваяводства на сейм у Варшаву, а таксама ў мясцовыя сеймікі. На адным з павятовых сеймаў Лышчынскага "з усеагульнага ўхвалення шляхты" выбралі падсудкам брэсцкага земскага суда, і ён быў у 1682 г. зацверджаны на гэтай пасадзе каралём Янам III.

Будучы прыхільнікам ідэй асветніцтва, ён у сваім маёнтку адкрыў школу, у якой сам выкладаў мовы і асновы розных навук. У адрозненне ад многіх іншых навучальных устаноў, тут, акрамя хлопчыкаў, вучыліся і дзяўчынкі, разам з дзецьмі шляхты сюды хадзілі і сялянскія дзеці. Усё гэта надавала школе глыбокі дэмакратычны характар і рабіла яе не падобнай ні на адну тамашнюю школу таго часу. На жаль, да нашых дзён не знойдзены дакументы, якія б раскрывалі гэты бок дзейнасці Казіміра Лышчынскага.

К.Лышчынскі, які быў глыбока перакананы ў сваіх атэістычных поглядах, не дапускаў нават ніякага сумнення адносна неабходнасці безрэлігійнага выхавання. Адзначым, што ў той час непахісна пануючым дагматам рэлігійнай этыкі езуітаў было сярэдневяковае вытлумачэнне рэлігійных норм як запаветаў Бога. Яшчэ горш, што права маральнай ацэнкі чалавека і яго дзейнасці атрымлівалі служкі афіцыйнай царквы. Галоўнымі крытэрыямі маральнасці ў іх уяўленні былі: пакорлівасць, усведамленне ўласнай бездапаможнасці і грахоўнасці з вынікаючым адтуль самазневажаннем. Праца выступала ў якасці пакарання за першародны грэх. Здароўе і прыгажосць не маглі ўпісацца ў звод хрысціянскіх дабрачыннасцей. Самастойнае імкненне да ведаў – хутчэй ад д'ябла, чым





ад Бога. Крайні аскетызм па сутнасці вянчаў гэтую іерархічную лесвіцу "дабрачыннасцей".

У школе Казіміра Лышчынскага не маглі існаваць каталіцка-езуіцкія прынцыпы выхавання, бо там ставілася задача свецкага маральнага развіцця чалавека, раскрыцця і ўдасканалення яго творчых здольнасцей. Фарміраванне асобы, на яго думку, павінна было грунтавацца на вывучэнні асноў навук і абапірацца на дакладныя веды аб прыродзе і грамадстве. Вызваляючы мараль ад путаў рэлігіі, К.Лышчынскі ў сваёй школе сцвярджаў думку аб духоўнай свабодзе чалавека, рэгулятарам паводзін якога павінны быць не рэлігійныя правілы, а розум і сумленнне. Мысліцель-педагог сам служыў яскравым прыкладам для сваіх вучняў. На пасяджэннях суда Лышчынскі абараняў інтарэсы бедных сялян, у многіх працэсах выносіў рашэнні не на карысць езуітаў. Груба парушыўшы царкоўныя каноны, ён выдаў сваю дачку замуж за каханага, шлюб з якім з нагоды блізкага сваяцтва катэгарычна забараняўся. За такі грэх яго адлучылі ад царквы. У школе Лышчынскага панавалі гуманістычныя ідэі. У якасці галоўнай каштоўнасці аб'яўляўся чалавек і вартасць яго асобы, маральныя якасці якой не дадзены аднекуль зверху, а ствараюцца ў натуральнай жыццёвай практыцы, і выхаванне пры гэтым адыгрывае рашаючую ролю.

Погляды беларускага атэіста фарміраваліся яшчэ ў часы навучання ў калегіуме, дзе ён часта задаваў "грэшныя" пытанні, выказваў парадаксальныя меркаванні пра Бога, анёлаў і рэлігію. Навучэнец Казімір Лышчынскі выявіў "асаблівыя прыкметы здольнай, дасціпнай галавы, якую напружваў... на ўсемагчымыя грахоўныя пытанні" [3, с. 271], - такое сведчанне аб пачатку фарміравання светапогляду будучага філосафа прыводзіць на аснове першакрыніц беларускі вучоны М.Алексютовіч. На юнака за падобныя погляды накладвалі адпаведныя спагнанні, адмаўляючы яму ў школьных прывілеях і забеспячэнні. Аднак гэта не спыняла Казіміра, і ён выказваў свае думкі іншым навучэнцам, але ўжо патаемна.

Пасля выхаду з езуіцкага ордэна К.Лышчынскі ўзяўся за вывучэнне літаратуры, права, тэалогіі і філасофіі. Ён імкнуўся сам знайсці адказы на хвалюючыя яго сацыяльныя і духоўныя пытанні. І чым глыбей займаўся антычнай філасофіяй, тэалогіяй, сучаснай яму літаратурай, у тым ліку і забароненай, тым больш умацоўвалася вера ў хлуслівасці рэлігійнага тлумачэння рэчаіснасці. Даследуючы ўсе даступныя яму крыніцы, Казімір Лышчынскі зрабіў бескампрамісны, катэгарычны вывад: "Выходзіць, Бога няма"[1, с. 134].

Варта адзначыць, што ніхто з мысліцеляў эпохі Адраджэння ні ў адной краіне не ўзняўся да ўзроўню адмаўлення Бога наогул. Многія ахіналі свае меркаванні ў адзенне пантэізму ці дэізму, таму такая выснова К.Лышчынскага ўяўляла сабой новы рэвалюцыйны ўзлёт чалавечай думкі. У адной з захаваўшыхся першакрыніц апісваецца, як працаваў слынны

мысліцель-атэіст з тэалагічнымі творамі. Так, пры вывучэнні кнігі пратэстанцкага багаслова Альстэда «Натуральная тэалогія» ён на палях рабіў такія заўвагі: "нікчэмны доказ лёгкавернага чалавека", "памыляецца і меле языком лёгкаверны дурань", "значыць, Бога няма" і т.п.

Усе свае атэістычныя ідэі і вывады доказна і абгрунтавана К.Лышчынскі выклаў у трактаце "Аб неіснаванні Бога"(«De non existentia Dei»), што быў напісаны на 265 аркушах у традыцыйнай тады форме пытанняў і адказаў веруючага і атэіста. У адрозненне ад многіх сваіх папярэднікаў – вялікіх мысліцеляў розных краін і народаў -- у Казіміра Лышчынскага атэістычнае светаўспрыйманне ўяўляе сабой строгую сістэму без усякіх завуаліраванняў і агаворак, яго погляды паслядоўныя і аргументаваныя. Ён адмаўляе само існаванне Бога, адкідае ўсе, без выключэння, рэлігійныя дагматы. Ваяўнічы атэіст-педагог выступаў не толькі супраць пануючых форм каталіцызму, але і супраць любой рэлігіі наогул, не прызнаючы любое тэалагічнае вучэнне. Заўзята бічаваў К.Лышчынскі духавенства, называючы яго прадстаўнікоў "рамеснікамі пустазвонства, паўзучымі гадзюкамі, сляпакамі, якія хлусяць, што бачаць у цемры" [3, с. 296]. Па яго перакананню, служыцелі культу маюць амаральную сутнасць, яны не настаўнікі, а спакуснікі. К.Лышчынскі абураўся, што такое «набожнае ашуканства» робіцца «ілжэмудрацамі» дзеля ўласнай карысці.

Езуіты, безумоўна, не маглі дараваць такой здрады "уцекачу з ордэна". У 1687 г. 15 сшыткаў рукапіснага трактата ўкраў яго сусед Ян Бжоскі і данёс віленскаму епіскапу, які дабіўся асуджэння ці пакарання крамольнага аўтара. Пасля некалькіх тыдняў судовага разгляду намаганнямі епіскапаў ерэтыку вынеслі смяротны прыгавор: "Казімір Лышчынскі павінен быць вывезены за горад і спалены на вогнішчы разам са сваімі творамі ў руках. Маёмасць яго будзе канфіскавана, дом, у якім ён жыў, разбураны, і месца пакінута пустыром на вечныя часы" [1, с. 130].

Цяпер у распараджэнні даследчыкаў вельмі мала крыніц, якія раскрываюць веліч духоўнага і грамадзянскага подзвігу настаўніка і мысліцеля. Да нас дайшла частка матэрыялаў следства, выказванні пра яго прадстаўнікоў духавенства, вынікі вывучэння творчай спадчыны і дзейнасці К.Лышчынскага нямецкім гісторыкам XVIII ст. Г. Сейлерам і інш. Вельмі каштоўнай стала знаходка польскім гісторыкам А.Навіцкім у 1957 г. пяці фрагментаў з трактата "Аб неіснаванні Бога". Галоўная думка гэтай часткі твора – "Чалавек – стваральнік Бога, а Бог – тварэнне і стварэнне чалавека. Такім чынам, людзі творцы і стваральнікі Багоў, і Бог з'яўляецца не рэчаіснай сутнасцю, а тварэннем розуму, і да таго ж хімерычным" [1, с. 133-134]. З'яўляючыся перакананым носьбітам поглядаў стыхійнага матэрыялізму, К.Лышчынскі не прызнаваў існавання ў прыродзе любых звышнатуральных сіл. Адмаўляючы наяўнасць таго свету, мысліцель замахнуўся на адзін з галоўных пастулатаў тэолагаў—бессмяротнасць душы. Паводле судовых абвінавачванняў, ён не верыў ні ў рай, ні ў пекла,





параўноўваў душы людзей з душамі жывёл. У гэтым накірунку беларускі атэіст апярэдзіў такога волата думкі, як Вальтэр, які сцвярджаў, што калі б меў бессмяротную душу чалавек, то яе мела б і блыха.

У сваёй лагічнай паслядоўнасці беларускі атэіст зрабіў вывад, што "рэлігія ўстаноўлена людзьмі няверуючымі для таго, каб іх саміх ушаноўвалі... Вера ў Бога ўведзена бязбожнікамі" [3, с. 286]. Ён бачыў у грамадстве наяўнасць людзей, якія зацікаўлены ў рэлігійным падмане народа.

Мысліцель-атэіст не спыняецца на адмаўленні звышнатуральных сіл на небе, матэрыялістычны падыход да прыроды ён спрабуе перанесці ў сацыяльнае жыццё. У яго выказваннях выразна гучаць ноты сумнення ў справядлівасці існаваўшага грамадскага парадку. На судовым пасяджэнні К.Лышчынскага абвінавачвалі ў тым, што ён жадаў "мець свет без улады, гарады без начальнікаў, народы без цароў" [1, с.132]. З гэтага можна ўявіць сацыяльна-палітычныя погляды вольнадумнага настаўніка. Тут заўважаецца яго мара аб справядлівым, дэмакратычным ладзе, у аснове якога ляжыць грамадзянская і духоўная свабода асобы. Таму невыпадкова К.Лышчынскага адносяць да ліку першых беларускіх сацыялістаў-утапістаў. Слынны педагог быў прыхільнікам ідэй Асветніцтва і заставаўся на пазіцыях стыхійнага матэрыялізму. Нездарма К.Лышчынскага параўноўваюць з выдатным італьянскім філосафам XVII ст. Тамаза Кампанелла. Хаця мусім заўважыць, што погляды замежнага мысліцеля, ў адрозненне ад падыходаў беларускага радыкаліста, не пазбаўлены рэлігійнага ўплыву.

З пазіцый сённяшняга дня, магчыма, многімі безрэлігійная канцэпцыя маралі, якую прапаноўваў айчынны мысліцель, і ўспрымаецца недастаткова абгрунтаванай і не зусім паслядоўнай. Але ж, улічваючы гістарычныя ўмовы, неардынарны, хаця небяспрэчны ўзлёт думкі К.Лышчынскага, такі падыход не можа не ўражваць яго патомкаў. Безумоўна, атэістычныя падыходы ў этыка-педагагічнай думцы Беларусі былі рэдкім выключэннем з існаваўшай рэчаіснасці, але яны значна паскорылі працэс набліжэння тэарэтычных ідэй да рэалій жыцця. Сама чалавечая асоба ў этыка-педагагічных дактрынах паступова займала ўсё больш значнае месца. Жыццесцвярджальныя ідэі арыентавалі на актывізацыю ролі чалавека ва ўласным маральным удасканаленні.

Адна з галоўных асаблівасцей ваяўнічага атэізму К.Лышчынскага заключалася ў тым, што ён не проста адмовіўся ад веры ў існаваўшыя рэлігійныя дагматы, а ўжо нават у школьныя гады, як сведчылі абвінаваўцы, "з асаблівым красамоўствам" спрабаваў схіліць да сваіх поглядаў іншых. У сваім свецкім жыцці К.Лышчынскі, асабліва пасля выбрання падсудкам брэсцкага земскага суда /гэта ў нейкай ступені абараняла яго ад праследаванняў езуітаў/, у дыспутах і спрэчках вёў адкрытую атэістычную прапаганду. І рабіў гэта паспяхова, што і

адзначалася на судзе: "Лышчынскі пачаў яўна заражаць гэтай навукай, як ядавітай атрутай, нявінныя розумы маладых і дарослых людзей..."[1, с.132].

Служкі культу імкнуліся дзёрзкае вальнадумства і атэізм К.Лышчынскага паказаць выпадковай з'явай, ніякім чынам не звязанай з тым асяроддзем, у якім ён жыў. Кожны радок абвінавачвання ў яго адрас напоўнены нянавісцю і зласлоўем. Не саромеючыся ў выразах, называючы атэіста ўсялякімі абразлівымі словамі, каралеўскі пракурор спрабаваў прадставіць справу так, што К.Лышчынскі "першы і няхай бы апошні ў польскім свеце ерэтык"[3, с. 294]. Каталіцкія інквізітары хацелі паказаць грамадскасці, "што давялі яго да гэтага паганскія сафізмы, чытанне кніг, якія забаронены божай царквой і выдадзеныя недзе за морам... Ён да таго начытаўся кніг, што пазбавіўся розуму" [3,с. 298].

Безумоўна, светапогляд К.Лышчынскага фарміраваўся пад уздзеяннем антычных філосафаў і еўрапейскіх дзеячоў эпохі Адраджэння. Аднак і ў самой Беларусі элементы матэрыялістычнага вучэння яўна прасочваюцца ўжо з XV ст. Гуманістычныя ідэі Францыска Скарыны перараслі ў скрытую апазіцыйнасць царкве Сымона Буднага і выліліся ў адкрыта варожыя адносіны да рэлігіі ў мазырскага суддзі Стэфана Лована /Яна Лавейкі/.

Таму езуіты не без падстаў баяліся, што ідэі "першага настаўніка атэістаў" могуць знайсці спрыяльную глебу на беларускіх землях, а таму гэта палохала іх больш за ўсё. Яны лічылі, што злачынства К.Лышчынскага "пераўзыходзіць усе, якія ёсць на свеце. Бо меншымі з'яўляюцца... забойствы бацькі, маці, брата, дзіцяці..." [1, с. 300].

Само імя К.Лышчынскага прыводзіла ў сапраўднае шаленства прадстаўнікоў афіцыйнай царквы. Нават адрачэнне, падобна Галілею, ад свайго вучэння, каб выратаваць сваё жыццё, не дапамагло настаўніку. Каб і пасля смерці мысліцеля нічога ад яго не засталося і нічога аб ім не напаміналa, попел пасля спальвання трупа змясцілі ў снарад і выстралілі з гарматы. Аднак можна забіць чалавека і знішчыць яго працу, але нельга забіць ідэю. Пасля пакарання атэіста багаслоў Петр Грэк з жахам напісаў: "Ен падарваў асновы рымска – каталіцкай веры" [8, с. 135]. Зярняты атэізму, пасеяныя К.Лышчынскім у XVII ст., далі дружныя ўсходы ў XVIII ст. і ў пазнейшы час. Стаў набіраць сілу працэс развіцця свецкай культуры.

Беларускага мысліцеля – атэіста, матэрыяліста і педагога -- не без падстаў параўноўваюць з вядомымі італьянскімі атэістамі Лючыліе Ваніні і Джардана Бруна. Дзякуючы смеласці, глыбіні і шырыні думкі, паслядоўнасці яго поглядаў, сацыяльнаму накірунку, значэнне яго філасофскай і педагагічнай спадчыны выходзіць за межы Беларусі і займае адно з пачэсных месцаў у гісторыі сусветнага атэістычнага руху.

Памяць беларускага народа аб сваім настаўніку атэістаў жыве разам з яго вучэннем. Імя К.Лышчынскага з'яўляецца гонарам не толькі нашага народа, але польскага і літоўскага. Яго спадчыну вывучалі і вывучаюць французскія, англійскія, шведскія і італьянскія вучоныя.





Яшчэ пры жыцці К.Лышчынскі падрыхтаваў сабе надмагільны надпіс: "Гэй, прахожы! Не праходзь міма гэтых камянёў, не выбірай іншай дарогі, аб іх не спатыкнешся, калі не спатыкнуўся на ісціне. Вучыся праўдзе ў камянёў, бо нават тыя людзі, якія ведаюць, што гэта праўда, вучаць, што яна ёсць хлусня. Вучэнне мудрацоў – свядомы падман" [1, с. 134].

Сам Казімір Лышчынскі спатыкнуўся аб камяні цемрашальства і нецярпімасці да іншадумства. Але такія, як ён, пракладвалі дарогу іншым. I справа не столькі ў тым, прызналі яго думкі наступнікі ці не. Галоўнае, што ім быў дадзены ўзор крытычнага падыходу да рэчаіснасці і спробы яе рацыяналістычнага асэнсавання.

**Літаратура**


1.Антология педагогической мысли Белорусской ССР.– М., 1986.

2.Друшчыц В.Казімір Лышчынскі – бязбожнік XVII веку. // Полымя, 1927.– №2.

3.Из истории философской и общественно-педагогической мысли Белоруссии .–Мн., 1962.

4.Из истории свободомыслия и атеизма Белоруссии.– Мн., 1978.

5.Лыщинский Л. Род дворян Лыщинских. - Спб., 1907.

6.Мараш Я. Змагар супраць цемрашальства // Маладосць.– 1961.– №7.– С. 134-136.